# З Новым годам!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

**Беларускі УНІВЕРСІТЭТ**

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (871) ● ПЯТНІЦА, 29 снежня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

## ВІНШАВАННІ СЯБРОЎ

У гэтыя дні рознакаляровым патокам ідуць ва універсітэт віншавальныя паштоўкі з розных куткоў нашай краіны, з прадпрыемстваў і навучальных устаноў рэспублікі.

Кастрычніцкі райком КП Беларусі г. Мінска і выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных горача віншуюць універсітэцкі калектыў з вялікімі поспехамі, дасягнутымі ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя утварэння СССР, і ўзнагароджаннем Юбілейнай граматай ЦК КП Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

Сардэчна віншуюць са слаўным юбілеем — 50-годдзем утварэння Саюза ССР і наступаючым навагоднім святам:

Калектыў Ужгарадскага дзяржаўнага універсітэта.

Калектыў Ленінградскага ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Жданава.

Рэктарат і грамадскія арганізацыі Вільнюскага дзярж-універсітэта.

Саюз пісьменнікаў БССР.

Калектыў Белдзяржкансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

Камітэт камсамола Мінскага аўтазавода.

Калектыў Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай.

Камітэт камсамола БСГА і многія іншыя.

Сябры жадаюць нашаму калектыву новых поспехаў у развіцці навукі, у камуністычным выхаванні моладзі, моцнага здароўя і шчасця студэнтам, выкладчыкам і усім супрацоўнікам універсітэта.

*Уладзімір ПАЎЛАЎ, выпускнік БДУ*

## РАДЗІМЕ, ПАРТЫІ, НАРОДУ

Я ўсё павінен мераць роднай хатай,
Таварышамі, ўсмешкамі сяброў:
І стрэл «Аўроры», і вагу мандата,
І на васьмушках харчатрадаў кроў.

Я ўсё павінен помніць да драбніцы.
Мне памяць бацькі не дае забыць,
Як поўз ён да варожае байніцы,
З якой хацелі і мяне забіць.

Я помню ўсё...
А ў думках чалавеку
Ад часу ні схавацца, ні ўцячы.
І першага савецкага паўвека —
І на маім натруджаным плячы.

У буданах палескіх залівала.
Саха трашчала, хоць сябе ўпражы.
З паўвекавое высі перавалу
Мне бачна ўсё, што мой народ пражыў.

Гатовымі у рукі не даюцца
Ні на зямлі, ні ў небе бальшакі.
Апошнія няверы прызнаюцца:
«А ўсё-ткі малайцы бальшавікі!»

Працягвайся ж, цудоўнае імгненне,
Табе любыя далі па плячу!
Законамі зямнога прыцягнення
Эпоха мерыць цягу к Ільічу.

Мы ўдумнай, светлай сталасцю багаты,
Мы маем пяцьдзесят гадоў-кручызн,
Як пяцьдзесят падпісаных мандатаў
На права уваходу ў камунізм.

## ВЫНІКІ ПАДВЕДЗЕНЫ

Ідучы насустрач вялікаму святу дружбы і братэрства усіх народаў нашай краіны — 50-годдзю ўтварэння СССР, калектыў студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта уключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар гэтай знамянальнай падзеі. На факультэтах і кафедрах, ва ўсіх падраздзяленнях былі прыняты і паспяхова выкананы павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Праведзена вялікая арганізатарская, палітыка-выхаваўчая і прапагандысцкая работа, накіраваная на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Многа зроблена па ўдасканаленню навучальнага працэсу, павысілася эфектыўнасць навуковых даследаванняў, палепшаны патэнтна-ліцэнзійная і інфармацыйная службы.

Партыйныя, камсамольскія і грамадскія арганізацыі факультэтаў, кафедры на больш высокім узроўні вялі палітыка-выхаваўчую і ваенна-патрыятычную работу. Вялікая ўвага была ўдзелена культуры вытворчасці, ахове працы, расшырэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 50-годдзя СССР першае месца прысуджана калектыву хімічнага факультэта, другое — калектыву філалагічнага факультэта, трэцяе заняў калектыў біялагічнага факультэта.

Сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр на першае месца выйшла кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

У выніку сацыялістычнага спаборніцтва на факультэтах пераможцамі прызнаны кафедры: неарганічнай хіміі, беларускай літаратуры, біяхіміі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, гісторыі журналістыкі, фізічнай геаграфіі, фізікі паўправаднікоў, крыміналістыкі, агульнай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі.

Актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве прынялі і студэнты.

Усім пераможцам уручаны вымпелы і ганаровыя граматы рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта.

Ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і мясцкома ўзнагароджаны таксама калектывы вучэбнага і навуковага аддзелаў, бібліятэкі, бухгалтэрыі.

У гэтыя дні ўвесь калектыў універсітэта шырока разгортвае сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае ажыццяўленне ў новым годзе задач, пастаўленых перад вышэйшай школай.

**А. ПАЛЬЦАЎ,**
**М. ЯФІМЧЫК.**

Савет дружбы універсітэта ад імя ўсіх замежных студэнтаў, якія вучацца ў БДУ, сардэчна віншуе калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна са знамянальным юбілеем — 50-годдзем утварэння СССР, жадае студэнтам, выкладчыкам, супрацоўнікам вялікіх поспехаў у будаўніцтве камунізму.

САВЕТ ДРУЖБЫ.




Мал. студэнта А. ЦЫГУЛЕВА.

● РАСКАЗВАЮЦЬ ПЕРАМОЖЦЫ ● РАСКАЗВАЕМ АБ ПЕРАМОЖЦАХ

# ГОД НАПРУЖАНАЙ ПРАЦЫ

Калектыў кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў удастоен высокай ацэнкі за поспехі, дасягнутыя ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя утварэння СССР. Што нам дапамагло дабіцца гэтых поспехаў? Перш за ўсё. — дружная і зладжаная праца ўсяго калектыву кафедры і цесная сувязь з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі факультэтаў.

Рыхтуючыся да сустрэчы 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, мы вялікае значэнне надавалі і надаем сувязі вывучэння гісторыі КПСС з рашэннем задач камуністычнага будаўніцтва. З гэтай мэтай сістэматычна абмяркоўваем на кафедры і метадычных секцыях тэксты лекцый, вынікі ўзаеманаведвання лекцый і семінарскіх заняткаў. Шырока практыкуем правядзенне адкрытых лекцый і семінараў. Асаблівую ўвагу ўдзяляем выкарыстанню тэхнічных сродкаў у навучальным працэсе, такіх, як тэлебачанне, магнітафон, дыяпазітывы. Увайшло ў практыку сістэматычнае правядзенне экскурсій у музеі, на прамысловыя прадпрыемствы, па месцах рэвалюцыйнай і баявой славы савецкага народа, сустрэчы са знатнымі людзьмі рэспублікі і ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. За 1972 год кафедра правяла 109 экскурсій і сустрэч. Усё гэта садзейнічае больш глыбокаму вывучэнню студэнтамі слаўнай гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, выхоўвае іх у духу патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

Выкладчыкі кафедры вядуць вялікую навукова-даследчую работу па найбольш важных праблемах гісторыі КПСС, Кампартыі і камсамола Беларусі, Кампартыі Заходняй Беларусі і іншых актуальных пытаннях сучаснасці.

За пяць год існавання кафедры падрыхтаваны і абаронены тры доктарскія і 12 кандыдацкіх дысертацый. Навуковая прадукцыя склала больш 130 друкаваных аркушаў.

Многа ўвагі ўдзяляюць выкладчыкі далучэнню студэнтаў да навукова-даследчай работы. Толькі ў 1972 годзе з дакладамі і рэфератамі на навуковых канферэнцыях выступіла звыш 200 студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў.

Наша практычная дзейнасць не абмяжоўваецца толькі сценамі універсітэта. Кафедра ужо многія гады вядзе абласны семінар прапагандыстаў па гісторыі КПСС пры Мінскім Доме палітасветы. Выкладчыкі праводзяць і вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод насельніцтва горада Мінска і рэспублікі. Сістэматычна выступаюць перад працоўнымі Г. Г. Герасіменка, Е. М. Русакова, Н. П. Хрыпко, Г. А. Калініна, Е. Н. Захватаева і іншыя. Многія выкладчыкі прымаюць удзел у навуковых канферэнцыях. Так, вясной гэтага года на навукова-тэарэтычнай канферэнцыі ў Валгаградзе па праблемах інтэрнацыянальна-патрыятычнага выхавання моладзі выступілі дацэнт Р. А. Малюковіч і асістэнт Я. Н. Асіпкова; у тэарэтычнай канферэнцыі, якая праводзілася Барысаўскім ГК КПБ, удзельнічалі дацэнты А. В. Царук, М. В. Прылепка, Г. Г. Герасіменка; на юбілейнай канферэнцыі універсітэта, прысвечанай 50-годдзю утварэння СССР, выступілі з навуковымі дакладамі дацэнт К. К. Герман і старшы выкладчык В. Ф. Ладысеў.

Мы разумеем, што перад намі стаяць вялікія задачы па выкананню рашэнняў XXIV з'езда нашай партыі ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для нашай краіны. Калектыў кафедры зробіць усё для таго, каб выканаць гэтыя задачы.

**Т. ПРЫТЫЦКАЯ,**
**загадчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.**





# Самы памятны

**«Ваш самы памятны Новы год?» Такое пытанне мы задалі напярэдадні свята выкладчыкам, супрацоўнікам, студэнтам, людзям розных пакаленняў, тым, хто сваёй працай і ратным подзвігам мацаваў магутнасць Радзімы, і тым шчаслівым нашчадкам, што прынялі эстафету камуністычнага будаўніцтва.**

*І. І. ТРУХАН, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі СССР:*

— Для мяне як выкладчыка, які чытае курс «Эканамічнае раяніраванне СССР», вельмі памятным з'яўляецца 1939 год. Тады адбыўся XVIII з'езд партыі. У яго рашэннях упершыню была сфармулявана ідэя комплекснага развіцця народнай гаспадаркі ў эканамічных раёнах, дакладна ўказваліся прынцыпы размяшчэння прамысловасці ў адпаведнасці з новым раяніраваннем.

Для састаўлення трэцяга пяцігадовага плана і падрыхтоўкі генеральнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 15 год была створана новая сетка эканамічных раёнаў. На Усходзе, Урале, у Паволжы у трэцяй пяцігодцы намячалася стварыць прадпрыемствы-дублёры па раду галін машынабудавання, нафтаперапрацоўкі і хіміі, каб ліквідаваць выпадковасць у забеспячэнні некаторымі прамысловымі прадуктамі з прадпрыемстваў-унікумаў.

Рашэнні XVIII з'езда партыі аказалі велізарны ўплыў на далейшую распрацоўку метадалогіі савецкага эканамічнага раяніравання. Яны захоўваюць сваё актуальнае значэнне і цяпер у сувязі з распрацоўкай доўгатэрміновага перспектыўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1990 гады і здзяйсненнем найбольш рацыянальнага размяшчэння вытворчых сіл у краіне.

*Г. А. ЛАЗЕРКА, выкладчык кафедры фізічнай хіміі:*

Успамінаецца год 1944-ы. Упершыню пасля цяжкіх год акупацыі сустрэліся ў Мінску студэнты універсітэта. Універсітэт вярнуўся з Падмаскоўя, са станцыі Сходня, куды быў эвакуіраван у першыя дні вайны. З усіх канцоў Савецкага Саюза з'ехаліся ў вызвалены Мінск яго навучэнцы, раскіданыя вайной. Усяго нас бы-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

# АДЗІН ДЗЕНЬ У ХІМІКАЎ





● Як заўсёды, гэты дзень запоўнен званкамі, лекцыямі, практычнымі. Як заўсёды, сёння шумна на паверхах у час перапынкаў. Што новага ў факультэцкай газеце, у бюлетэні СНТ? А вось гэты стэнд — «Фотаконкурс «Радзіма» — з'явіўся нядаўна. Цікава расказвае аб нашай Радзіме лірычнае і жартаўлівае вока аб'ектыва.

Напружана і ў лабараторыях. Практыкум — гэта ж не толькі практычны спосаб засваення лекцыйнага курса. Гэта — творчасць. Таму і пануе заўсёды такі працоўны настрой сярод гэтых прабірак і колбаў. Тое, што сёння студэнты робяць у лабараторыі, заўтра спатрэбіцца ім на вытворчасці. «Вызначэнне каэфіцыенту актыўнасці электраметрычным метадам — гэта цікава», — чытаем на тварах Галі Стэльмах і Валодзі Кур'яновіча. (На здымку ўнізе).

На лекцыі ўсё было быццам бы проста для Наташы Кашчэевай. А на практыцы?.. Праўда, з усім незразумелым можна звярнуцца да Галіны Андрэеўны Лазеркі, якая заўсёды дапаможа. (На здымку ўверсе).

● Спецпрактыкум у студэнтаў пачынаецца на IV курсе. Але ўжо на I—II курсах самыя цікаўныя — частыя госці ў лабараторыях. У апошнія гады на кафедры фізхіміі перагледжана праграма практыкумаў, уведзена абарона курсавых работ на IV курсе. Гэтыя работы, як правіла, эксперыментальныя. Многія з іх будуць пакладзены ў аснову дыпломных работ.

Праблема найбольш поўнай ацэнкі ведаў студэнтаў на хімфаку — не апошняя. На кафедры аналітычнай хіміі вось ужо два гады выкарыстоўваюць машыну-экзаменатар «Ластаўка». Яна дапамагае паглыбіць работу студэнтаў над матэрыялам, бо пытанні «Ластаўкі» патрабуюць канкрэтнага адказу.

● 140 студэнтаў хімфака — члены СНТ. Навукова-даследчыя лабараторыі адначасова і школа, і майстэрня: тут не толькі набываюць веды, але і ўвасабляюць іх у жыццё. Студэнты атрымліваюць магчымасць непасрэдна ўдзельнічаць у пошуку, лепш пазнаёміцца з той навукай, якой збіраюцца прысвяціць жыццё. Аб тым, наколькі плённа працуюць студэнты, гавораць факты. Член СНТ студэнтка V курса Г. Сярдзюк атрымала аўтарскае пасведчанне аб вынаходстве, былы старшыня СНТ студэнт V курса Ю. Орлік накіраван для работы над дыпломнай тэмай у адну з вну Новасібірска.

● Студэнты — актыўныя удзельнікі работ па гаспадарчых дагаворах кафедр факультэта з установамі і вузамі краіны. Цесныя сувязі існуюць паміж кафедрай фізічнай хіміі і хімічным факультэтам Маскоўскага універсітэта, АН УССР, украінскім НДІ вогнетрывалых матэрыялаў, Ангарскім філіялам ОКБ Міністэрства хімічнай прамысловасці. У 1971 годзе работы па гаспадарчых дагаворах склалі суму 120 000 рублёў.

● Значнымі поспехамі ў выкананні гаспадарчых дагавораў вызначаецца кафедра аналітычнай хіміі, якую ўзначальвае прафесар Р. Л. Старобінец. Эфект закончанай нядаўна дагаворнай работы для Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства складае каля 2 мільёнаў рублёў.

Падрыхтавана справаздача аб частцы выкананых работ па дагавору з Мцэнскім інстытутам. У ліку непасрэдных удзельнікаў работы—студэнткі V курса С. Навакшонава і Т. Арцёмчык.

Апошнія абмеркаванні — і дэлегацыя ў саставе дацэнта кафедры Л. М. Аўсянкі і асістэнтаў В. Л. Ламакі і І. А. Вінорскага (на здымку ўверсе злева) адправіцца са справаздачай у Маскву.

● Жыццё факультэта — не толькі ў сценах корпуса. Яно — на прадпрыемствах, дзе практыкуюцца студэнты, у школах Мінска — цяпер там вядуць заняткі будучыя настаўнікі-хімікі, студэнты V курса. Яно працягваецца ў тых вялікіх і малых адкрыццях, якія нараджаюцца ў лабараторыях факультэта.

**Т. ЗАСІМ.**

Фота Д. Чаховіча.

# СВЯТА ДРУЖБЫ

Традыцыйны вечар інтэрнацыянальнай дружбы на геаграфічным факультэце сабраў нашых сяброў з В'етнама, Балгарыі, ГДР, Кубы і іншых дзяржаў.

Намеснік дэкана Р. А. Жмойдзяк расказаў аб дружбе савецкага народа з народамі сацыялістычных краін, аб дапамозе нашай краіны маладым развіваючымся дзяржавам. А пасля дэкан факультэта па навучанню замежных грамадзян К. К. Герман падзякаваў арганізатарам сустрэчы і расказаў аб жыцці замежных студэнтаў, аб іх вучобе.

Выступаюць прадстаўнікі В'етнама, Кубы, НРБ, ГДР. Усе яны цёпла гавораць аб нашым універсітэце, аб выкладчыках, аб савецкіх сябрах.

У такой жа сяброўскай атмасферы праходзіў і канцэрт. Студэнты з ДРВ выканалі песні савецкіх кампазітараў, кубінскія сябры паказалі свой нацыянальны танец. Кэнча Пацееў з НРБ падарыў прысутным песні аб Сафіі, аб роднай Балгарыі.

Развіталіся мы сябрамі, упэўненыя, што сустрэча гэта не апошняя, а сяброўства наша будзе яшчэ мацнейшым.

В. АНТАНОВІЧ,
член камітэта камсамола геафака.



*У шматнацыянальнай студэнцкай сям'і БДУ сустракаюць юбілей СССР і Новы год гэтыя юнакі, прыехаўшыя да нас з В'етнама, Алжыра, Афганістана, Конга, Сенегала, Бангладэш. Яны — студэнты падрыхтоўчага факультэта.*

Фота М. Нечыпарэнкі.

# ПАЖАДАННІ ДЭКАНАЎ

Напярэдадні навагодняга свята рэдакцыя разаслала дэканам факультэтаў невялічкую анкету з пытаннямі:

1. Якую праблему хутчэй за ўсё Вам (як дэкану) хацелася б вырашыць у новым годзе?

2. Вашы пажаданні студэнтам? (Ад якіх недахопаў ім патрэбна пазбавіцца перш за ўсё? Якімі б Вы жадалі бачыць сваіх выхаванцаў?).

Мы ўдзячны тым, хто адклікнуўся на наша запрашэнне, і прапануем увазе чытачоў адказы дэканаў на анкету рэдакцыі.

**Рыгор Васільевіч БУЛАЦКІ, дэкан факультэта журналістыкі:**

1. Праблему матэрыяльнага забеспячэння навучальнага працэсу, аснашчэння навейшым абсталяваннем кабінетаў. Увогуле паляпшэння якасці падрыхтоўкі работнікаў рэдакцый газет, радыё, тэлебачання, выдавецтваў, БелТА.

2. Журналіст — гэта спецыяліст асобага роду. Прафесія журналіста ўключае ў сябе: смеласць разведчыка, страснасць агітатара, аналітычную здольнасць вучонага, скрупулёзнасць летапісца, натхненне мастака, цярпенне настаўніка, мужнасць барацьбіта, вынослівасць спартсмена, таварыскую вернасць. Журналіст—перш за ўсё актыўны барацьбіт партыі. Ён павінен быць палітычна сталым чалавекам, глыбока ведаючым законы грамадскага развіцця.

Мне хацелася б, каб многія студэнты пазбавіліся ад недаўсведамлення таго, якім павінен быць журналіст, а таксама бачыць, што ўсе студэнты сапраўды жадаюць быць журналістамі, адпавядаючымі ўсім патрабаванням, якія прад'яўлялі да пралетарскіх публіцыстаў К. Маркс, Ф. Энгельс, У. І. Ленін — выдатныя журналісты, публіцысты.

**Уладзімір Трафімавіч ВОДНЕЎ, дэкан спецыяльнага факультэта прыкладной матэматыкі:**

1. Спецыяльны факультэт прыкладной матэматыкі створан для паскоранай падрыхтоўкі спецыялістаў па матэматычнаму забеспячэнню ЭВМ і АСУ. У 1973 годзе адбудзецца першы выпуск нашага факультэта. Хацелася б, каб наша праца не прапала, каб выпускнікі маглі з поспехам прымяняць атрыманыя веды, каб яны з гонарам насілі званне выпускніка Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Ад гэтага ў многім будзе залежаць і якасць набору 1973 года.

2. Хачу сказаць словамі акадэміка С. Струміліна: «Жадаю я ўсёй моладзі ніколі не старыцца душой, захоўваючы ўсю сваю юную прамату, смеласць і жыццярадаснасць; працаваць — без браку, сябраваць — без карысці, любіць— без здрады, пераадольваць перажыткі мінулага —без шкадавання і змагацца за свае ідэалы — без паражэнняў».

**Іван Станіслававіч ЦІШКЕВІЧ, дэкан юрыдычнага факультэта:**

1. Кожны год у дэкана такіх праблем шмат, і ўсе патрабуюць хуткага рашэння. Таму цяжка выдзеліць якую-небудзь адну. У 1973 годзе хацелася б, напрыклад, хутчэй адкрыць буфет у юрыдычным корпусе, выселіць з гэтага корпуса хімікаў, устанавіць тэлефоны, аднавіць вучэбныя кабінеты, атрымаць памяшканне для створанай кафедры крыміналістыкі, раздзяліць кафедру грамадзянскага права і працэсу, павысіць паспяховасць і дысцыпліну студэнтаў, выдаць новыя каментарыі да дзейнічаючых кодэксаў БССР, падручнікі... Пры актыўным садзейнічанні і пад кантролем рэктарата ўсе гэтыя планы могуць быць выкананы.

2. Весці сябе так, каб юрыстаў заўсёды і ва ўсім ставілі ў прыклад: у рэктараце, парткоме, мясцкоме, камітэце камсамола, прафкоме, на старонках універсітэцкай шматтыражкі, а таксама за межамі універсітэта.

**Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ, дэкан хімічнага факультэта:**

1. Вельмі хацелася б устанавіць прамую, цесную, дзелавую сувязь кафедр факультэта з хімічнымі прадпрыемствамі рэспублікі. Вывады з такога кантакту відавочны.

Яшчэ пажадана, каб хімічны корпус, нарэшце, адпавядаў свайму назначэнню. Хацелася б мець склад для хімічных рэактываў.

2. Ад усіх. Быць мэтанакіраванымі і арганізаванымі, умеючымі правільна планаваць і умела выкарыстоўваць час як для вучобы, так і для ўсебаковага развіцця і адпачынку.

**Іван Паўлавіч ЗЯЦЬКОЎ, дэкан фізічнага факультэта:**

1. Перш за ўсё мне б хацелася бачыць у новым годзе ажыццяўленне тых задач, якія паставіў перад сабой калектыў фізічнага факультэта, і, як адну з першачарговых, вырашыць задачу найбольш эфектыўнай, рацыянальнай арганізацыі і кантролю самастойнай работы студэнтаў, і асабліва студэнтаў малодшых курсаў, кафедрамі факультэта.

2. Нашым дыпламантам, студэнтам 5-га курса,—стаць у 1973 годзе фізікамі ў поўным сэнсе гэтага слова. Студэнтам малодшых курсаў — імкнуцца да гэтага і заўсёды памятаць, што фізіка—навука пярэдняга краю, яна такая ж цікавая, як і цяжкая.

Хацелася б усіх іх бачыць у будучым дастойнымі прадаўжальнікамі лепшых традыцый беларускай школы фізікаў.

**Юрый Канстанцінавіч ФАМІЧОЎ, дэкан біялагічнага факультэта:**

1. Хутчэй завяршыць будаўніцтва інстытута фізікі і перадаць біястанцыю ў Шчамысліцы біялагічнаму факультэту.

2. Пажадаў бы большай працаздольнасці. А бачыць хацелася б сваіх студэнтаў без «хвастоў».

**Яўген Аляксеевіч ІВАНОЎ, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі:**

1. У новым годзе хацелася вырашыць не адну, а адразу некалькі праблем, важных з пункту гледжання інтарэсаў факультэта.

Па-першае, трэба ўмацаваць кафедры спецыялістамі ў галіне матэматычнага забеспячэння ЭВМ і АСУ, па-другое, хацелася б, каб у новым годзе заняткі на факультэце вяліся ў адну змену — першую, і, нарэшце, хацелася б, каб была створана студэнцкая вылічальная зала з адпавядаючым абсталяваннем для таго, каб студэнты маглі браць машынны час для індывідуальнага карыстання ЭВМ па асабістаму жаданню (пры выкананні дамашніх заданняў, курсавых і дыпломных праектаў).

2. Жадаю ўсім студэнтам выдатнага здароўя, асабістага шчасця і, вядома, поспехаў у вучобе, у прыватнасці на зімовых экзаменах.

У кожнага са студэнтаў ёсць свае добрыя якасці і свае недахопы. Да апошніх трэба аднесці, відавочна, усё тое, што не адпавядае маральнаму кодэксу савецкага грамадзяніна — будаўніка камунізму.

У новым годзе хацелася б, каб нашы студэнты валодалі толькі добрымі якасцямі.

# Самы памятны

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

ло тады 180 чалавек. Гэты калектыў уяўляў сабою універсітэт пасляваенны.

Мы сабраліся ў зале цяперашняй фабрыкі-кухні. Адзначылі свята — праводзілі 1944 і сустрэлі новы, 1945—проста, але было весела. Да гэтага часу успамінаецца той вечар і настрой.

Радасць сустрэчы, радасць вяртання зрабілі яго незабыўным. І яшчэ адна радасць, што не дае забыць 1944 год: мы сустрэліся са сваімі бацькамі, з якімі нас разлучыла вайна.

*А. Е. МАЛАЛЕТКІН, групparторг кафедры спектраскапіі:*

Мне міжволі ўспамінаецца новы — 1946-ы — першы пасляваенны год. Я тады служыў у радах Савецкай Арміі ў Літоўскай ССР. Трэба сказаць, што гэта быў, з аднаго боку, цяжкі год, таму што наша краіна, якая дабілася перамогі над гітлераўскім фашызмам, несла на сваіх плячах цяжар 4-гадовай, небывалай па маштабах і жорсткасці вайны. Людзі адчувалі патрэбу літаральна ва ўсім і, галоўнае, у акрайцы добрага, сапраўднага хлеба. З другога боку—гэта быў першы год—год мірнага будаўніцтва, гэта быў год спакойнага жыцця. Савецкія людзі, стомленыя ад вайны, упершыню маглі спакойна адзначыць традыцыйнае навагодняе свята.

У нашым клубе красавалася навагодняя ёлка, упрыгожаная самаробнымі цацкамі і асвятленнем (у магазінах тады цацак не было). На навагоднее свята сабраўся ўвесь асабовы састаў знішчальнага авіяцыйнага палка, які ўдзельнічаў у разгроме нямецкага фашызму. У кожнага з нас гэта было першае за ўсю вайну сапраўднае навагодняе свята. З дакладам аб выніках прайшоўшага года выступілі камандзір палка Герой Савецкага Саюза Н. П. Каблоў і камісар палка І. Л. Краснінін. Затым была паказана добрая салдацкая самадзейнасць.

Асабліва запомнілася на ўсё жыццё навагодняе віншаванне па радыё, звернутае да ўсяго нашага шматнацыянальнага народа. Гэта былі натхняючыя словы партыі і ўрада, якія мабілізавалі савецкі народ на новыя подзвігі ў гады пасляваеннага мірнага будаўніцтва.

*Вольга НЯСЮК, сакратар камітэта камсамола біяфака:*

— Лепш за іншыя я памятаю мінулы Новы год, год, калі мяне выбралі сакратаром камітэта камсамола. Ну, хіба ж забудзеш тое хваляванне, з якім рыхтавалі мы навагодні баль, тую перадсвяточную мітусню, калі я турбавалася аб усім нашым факультэце, аб сваіх сябрах. Найвялікшым неспакоем памятаецца мне год 1972-гі.

*Уладзімір ЛОДАЎ, студэнт І курса юрфака:*

— Усё жыццё чалавека — гэта няспынныя падзеі, парой зусім будзённыя і непрыкметныя, парой—значныя. Адыходзячы 1972 год самы значны, самы цудоўны ў маім жыцці. Гэта год майго паступлення на юрыдычны факультэт універсітэта, гэта год, калі я стаў членам КПСС. Гэта асабліва радасна ўсведамляць напярэдадні вялікага свята — 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР.

Хачу выказаць сваю глыбокую ўдзячнасць усім таварышам, якія аказалі мне сваё давер'е, прыняўшы мяне ў рады вялікай ленінскай партыі. Я прыкладу ўсе сілы, каб сваімі справамі, вучобай апраўдаць аказанае мне высокае давер'е.

# СУСТРАКАЮЧЫ ЮБІЛЕЙ

Вялікімі творчымі поспехамі сустракаюць навукова-педагагічныя работнікі універсітэта юбілей нашай дзяржавы. У плане навуковых даследаванняў кафедр і лабараторый 52 тэмы выконваюцца па пастановах Савета Міністраў СССР і Савета Міністраў БССР, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы. Яны ўключаны ў дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі нашай рэспублікі. Сумесна з працаўнікамі навуковых цэнтраў іншых рэспублік нашы вучоныя распрацоўваюць праблемы, звязаныя з біялагічнай ачысткай вады, выкарыстаннем ядзерных рэактараў у хімічнай прамысловасці, стварэннем тыпавых аўтаматызаваных сістэм кіравання прадпрыемствамі галіновых міністэрстваў.

Шырока вядомы за межамі нашай рэспублікі даследаванні ў галіне люмінесцэнцыі і спектраскапіі, тэрмадынамікі неарганічных злучэнняў, работы па вывучэнню азёрных вадаёмаў Беларускага паазер'я і азёрных раёнаў сумежных тэрыторый Паўночнага Захаду Савецкага Саюза, работ па стварэнню этымалагічнага слоўніка беларускай мовы, які з'яўляецца важным звяном у вырашэнні гісторыка-тэарэтычных праблем беларускага мовазнаўства.

Толькі ў 1972 годзе на базе універсітэта былі праведзены тры ўсесаюзныя канферэнцыі: «Радыяцыйныя дэфекты ў паўправадніках», «Вывучэнне прадуктыўнасці прэснаводных вадаёмаў», «Нелінейная оптыка», а таксама IV занальная нарада-семінар па методыцы выкладання фізікі ў вышэйшых навучальных установах.

Разам з правядзеннем фундаментальных даследаванняў, якія з'яўляюцца вядучымі ў навуковай працы універсітэта, лабараторыі і кафедры многа робяць для ўкаранення вынікаў сваіх даследаванняў у народную гаспадарку. Сёння выконваюцца 104 гаспадарча-дагаворныя навукова-даследчыя работы на суму 3 млн 176 тыс. рублёў. Сярод іх работы па ўдасканаленню тэхналагічных працэсаў і аўтаматызацыі вытворчасці; стварэнню кантрольна-вымяральнай апаратуры, рашэнню інжынерна-эканамічных задач і г. д. Эканамічны эфект пры ўкараненні гэтых распрацовак у народную гаспадарку ў многа разоў перавышае іх кошт. Так, укараненне распрацоўваемых кафедрай фізікі цвёрдага цела аб'ёмных металакерамічных награвальнікаў дасць толькі па Гродзенскаму заводу электрабытавых прыбораў больш 300 тыс. руб. эканоміі.

Галіновая лабараторыя па распрацоўцы аўтаматызаваных сістэм кіравання горнахімічнымі прадпрыемствамі, адкрытая на факультэце прыкладной матэматыкі, вырашае рознабаковыя задачы аптымальнага планавання і кіравання горнымі работамі, узбагачальнымі фабрыкамі камбіната «Беларуськалій», аўтаматызацыі бухгалтарскага ўліку і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Эфект ад укаранення распрацовак бягучага года складзе каля 200 тыс. рублёў. Другая галіновая лабараторыя гэтага ж факультэта прымае ўдзел у распрацоўцы электронна-герконавых сістэм камунікацыі з запісанымі праграмамі.

Мацнеюць і студэнцкія навуковыя сілы. Студэнцкае навуковае таварыства аб'ядноўвае сёння больш 4 тысяч студэнтаў, якія працуюць у навукова-даследчых лабараторыях і на кафедрах.

Ёсць свае поспехі і ў літаратурнага аб'яднання студэнтаў «Узлёт», студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі на фізічным факультэце, студэнцкага вылічальнага цэнтра на факультэце прыкладной матэматыкі, якія выконваюць заданні як па унутрыуніверсітэцкіх заказах, так і па сістэме дагавораў з рознымі арганізацыямі.

Распрацаваныя рэктаратам і парткомам універсітэта мерапрыемствы па ажыццяўленню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню работы вышэйшай школы» адкрываюць шырокія перспектывы развіцця навуковых даследаванняў.

А. ЧАЛЕЙ.

# СУСТРЭЧА

Здараецца ў жыцці так, што сустрэнеш чалавека, і ён застаецца ў тваіх успамінах на ўсё жыццё.

Летам мне давялося праходзіць практыку на паўвостраве Мангышлак. Але перш чым пачаць расказ аб сустрэчах з людзьмі, трэба некалькі слоў сказаць і аб гэтых мясцінах.

...Самалёт пайшоў на зніжэнне. На зялёна-сіняй марской вадзе пачаў вырысоўвацца пясчаны мыс. А вось і караван вярблюдаў унізе, і юрты жывёлаводаў... Але гэты малюнак раптам змяняе другі — прыгожы, на дзіва зялёны горад Шаўчэнка.

Збоку ў мяне сусед — такі жартаўлівы хлопец з Літвы. Увесь шлях пералёту праз Каспійскае мора мяне ўсё ўгаворваў вярнуцца, «пакуль не позна», дамоў, бо там жа пустыня, скарпіёны.

— Чаму ж тады вы не ўцякаеце дамоў?—запыталася я.

— А мы ўжо тут акліматызаваліся. На нас ужо ніякі яд не дзейнічае, — не здаваўся ён...

Назаўтра іду ў рэдакцыю.

— Вы, напэўна, яшчэ не паспелі пазнаёміцца з Мангышлакам? Дык на першы раз паедзеце ў камандзіроўку ў Форт-Шаўчэнка, — сказаў мне рэдактар газеты «Агні Мангышлака» В. Я. Запарожскі.

— Толькі не забудзьце,— папярэдзіў ён,—узяць з сабой усе неабходныя рэчы, бо можа прыйдзецца і пад дрэвам начаваць, гасцініцы там няма.

Жартам я ўжо не здзіўлялася і спрабавала адказваць гэтак жа:

— Ну, калі там дрэва ёсць, тады бяда невялікая. У такую спёку толькі пад дрэва і хавацца.

Гасцініца, канешне, там знайшлася. Але вось дрэва — ніводнага. Навокал толькі пясок. І раптам на самай ускраіне гарадка як бы зялёны аазіс. Накіроўваюся туды. На высокіх варотах надпіс: «Парк імя Т. Р. Шаўчэнкі».

...Там шмат людзей. Яны ўсё чысцяць, прыбіраюць, пракладваюць новую дарожку. Выціраючы пот з твару, дырэктар мемарыяльнага музея Т. Р. Шаўчэнкі Е. Умірбаеў цёпла і зацікаўлена запытаў:

— Вы з Украіны на свята да нас прыехалі?

— Не, з Беларусі.

— Выдатна. Мы вельмі рады, — пацісну ён мне руку. — Звярніцеся да Ліды, экскурсавода.

І вось гэтая Ліда запаланіла мяне зусім. Калі шчыра казаць, дык і на ўсё жыццё, мабыць.

Пераступіўшы парог музея, я ўбачыла прыгожую дзяўчыну. Жывыя, карыя вочы і пшанічнага колеру валасы такім родным рабілі яе твар, што я замест прывітання запыталася:

— Адкуль вы тут?

— Мне ўжо не першы раз задаюць такое пытанне. Але хіба цяжка аб гэтым здагадацца?

Доўга яна расказвала пра Украіну, пра школу, дзе вучылася, а потым правяла ў залу. Там ужо сабралася шмат гасцей, якія прыехалі святкаваць 40-годдзе музея.

А калі загаварыла Ліда Тахтамышава, не можна было адвесці вочы. Ад гэтай дзяўчыны веяла Украінай, радзімай вялікага кабзара. Здавалася, вось-вось рускую мову зменіць украінская, дзяўчына пачне гаварыць словамі паэта. Ліда не толькі расказала аб жыцці Т. Р. Шаўчэнкі ў ссылцы на Мангышлаку, але і аб любві вялікага мастака да казахскага народа. Сапраўды, на яго малюнках з такой цеплынёй і горыччу паказана беднасць простых людзей, маленькіх сірот-вандроўнікаў, цяжкасці лютай зімы... Ён жыў жыццём гэтых людзей, быў сведкай іх гора і нястачы.

І памяць аб вялікім сыне Украіны свята захоўваюць на казахскай зямлі. Ля музея ёсць зямлянка і калодзеж Шаўчэнкі, у парку растуць вербы, пасаджаныя яго рукамі.

— А гэта карціны, якія падарылі музею мастакі Украіны і Казахстана,—гаворыць Ліда.

Яны прысвечаны жыццю Т. Р. Шаўчэнкі, мясцінам, дзе ён бываў, увасабляюць будучыню, аб якой марыў кабзар. Тут і партрэт-вышыўка, і прыгожы габелен, на якім на рускай і казахскай мове выткана імя вялікага паэта Украіны, а таксама зямлянка і калодзеж, якія захоўваюцца па сённяшні дзень.

З якой шчырасцю і любоўю даносяць да нас вось гэтыя людзі бессмяротныя словы Шаўчэнкі, яго магутныя і смелыя мастацкія творы. І сам паэт, напэўна, не прадбачыў, якія вузы дружбы пракладзе яго творчасць паміж украінскім і казахскім народамі.

А Ліда! Яна як часцінка радзімы паэта, як водгук герояў карцін мастака будзе заставацца ў сэрцы кожнага, хто толькі наведае гэты музей.

М. МАЦЕЙКА,
студэнтка IV курса
журфака.




# ХАЧУ ВЕДАЦЬ БОЛЬШ

**Юрый Сакалоў — адзін з тых студэнтаў, хто складае гонар факультэта. Ленінскі стыпендыят, ён актыўна спалучае выдатную вучобу з грамадскай работай, захапляецца спортам і дабіўся выдатнага выніку: ён кандыдат у майстры спорту па гімнастыцы. Мы папрасілі Юрыя расказаць аб сваім захапленні фізікай, навуковых інтарэсах, аб тым, што дапамагае яму ў вучобе.**

— У 50-й сярэдняй школе, дзе я вучыўся многа ўвагі ўдзяляецца шырокаму вывучэнню прыродазнаўчых навук, часта праводзяцца навуковыя канферэнцыі па фізіцы і матэматыцы, куды запрашаюць навуковых работнікаў з інстытутаў, універсітэта, Акадэміі навук. З вялікім інтарэсам я ўдзельнічаў у гарадскіх алімпіядах: хацелася ведаць больш і глыбей. Гэта прывучыла займацца самастойна. У школе даводзілася ўдзяляць шмат увагі матэматыцы: алімпіяды, завочная матэматычная школа пры МДУ, але ўсё ж больш прыцягвала фізіка. Гэта і вызначыла ў далейшым мой выбар — фізічны факультэт БДУ.

Цяпер я на IV курсе. Зараз выконваю сваю курсавую работу ў лабараторыі фізікі інфрачырвоных праменняў Інстытута фізікі АН БССР. Перада мной пастаўлена задача — даследаваць эфектыўнасць перадачы энергіі (электроннай, вагальнай, вярчальнай) у працэсе няпругкіх малекулярных сутыкненняў. Пакуль гэта работа рашаецца мной у агульным выглядзе, а пасля давядзецца яе канкрэтызаваць. У будучым хацелася б займацца вагальнай рэлаксацыяй — адной з галін кінетычнай тэорыі лазераў.

Я з'яўляюся членам СНТ. Па-мойму, яно не толькі арганізуе студэнтаў, але і дазваляе быць больш мэтанакіраваным. Таму, думаю, трэба шырэй далучаць студэнтаў да навуковай працы ў СНТ. Цікавым было б правядзенне алімпіяд у межах факультэта. Яны абуджалі б навуковую зацікаўленасць і дапамагалі выяўляць больш таленавітых студэнтаў.

Што мне дапамагае добра вучыцца? Перш за ўсё разумнае спалучэнне заняткаў і свабоднага часу. Мне здаецца, што строгае планаванне свайго рабочага часу проста неабходна. Кожны дзень трэба ставіць перад сабой нейкую невялікую мэту, падпарадкаваную вялікай, і дабівацца яе.

Вялікі памочнік у вучобе — спорт. Ён хоць і патрабуе многа часу, але кампенсуе яго карысцю, якую прыносіць.



# Я расказваю пра Беларусь

Калі я здала ўступныя экзамены на аддзяленне журналістыкі ў Кішынёўскім універсітэце, мне прапанавалі ехаць вучыцца за межы Малдавіі. З двух прапанаваных гарадоў — Казані і Мінска — выбрала апошні. І не толькі таму, што гэта бліжэй дадому. Асабліва хвалявалі расказы пра партызанскае мінулае Беларусі, пра яе гераізм у гады Вялікай Айчыннай вайны. Хацелася ўбачыць тыя лясы, дзе кожнае дрэва памятае мінулыя баі.

Прайшло больш трох год з дня майго першага знаёмства з Беларуссю і яе людзьмі. Мінулі тыя цяжкасці, што ўзнікалі з-за няведання рускай мовы. Цяпер я цудоўна разумею і паспела палюбіць і беларускую мову.

Калі я прыязджаю дамоў у сваю вёску Трушэны, аднавяскоўцы заўсёды распытваюць мяне пра Мінск, яго жыхароў. Кожны раз я заходжу ў сваю школу, і там таксама цікавяцца жыццём, культурай, гісторыяй Беларусі. І я расказваю з асаблівым гонарам, як расказвала ў Мінску пра Малдову і яе людзей. Расказваю пра сваіх сяброў, пра вераснёўскую студэнцкую бульбу, пра беларусаў, добрых, чулых людзей, простых і сардэчных.

Цяпер, калі думаю, што давядзецца развітвацца з Мінскам, то не ўяўляю, як гэта адбудзецца. Я вельмі прывыкла да Беларусі, у мяне тут многа сяброў. Але веру, што гэтае развітанне ненадоўга. Буду рада новым сустрэчам з Беларуссю, буду чакаць у госці да сябе сяброў-беларусаў.

А. МАДАН,
студэнтка.

Спорт

# ВЯДОМЫ МАЦНЕЙШЫЯ

Амаль месяц у іграво зале БДУ былі чутны ўдары па мячу і бурныя апладысменты балельшчыкаў — праходзіла першынство па валейболу па праграме XXI універсітэцкай круглагадовай спартакіяды. У ім прынялі ўдзел мужчынскія і жаночыя каманды дзесяці факультэтаў. Дакладная арганізацыя спаборніцтваў, строгі графік сустрэч дазволілі правесці спаборніцтвы на высокім узроўні. Бескампрамісная гульня мацнейшых каманд выклікала вялікі інтарэс у аматараў валейболу.

У жаночым турніры першае месца заняла каманда факультэта прыкладной матэматыкі, якая ў цудоўным стылі перамагла сваіх саперніц. Сур'ёзнае супраціўленне дзяўчатам ФПМ аказала каманда юрфака, якая заняла другое месца. Трэцяе месца ў валейбалістак геафака.

Сярод мужчынскіх каманд мацнейшымі аказаліся фізікі, яны і занялі першае месца. Менш удачна выступіла мужчынская каманда ФПМ. У яе—II месца. На трэцім — каманда гістфака.

П. ГЕРАСІМОВІЧ,
член спортклуба БДУ,
студэнт.

# З ПЕРАМОГАЙ, ДЗЯЎЧАТЫ!

*На гэтым здымку толькі адзін з хвалюючых момантаў фінальнага матча на кубак БССР па баскетболу паміж жаночымі камандамі універсітэта і Інстытута народнай гаспадаркі. А колькі іх было ў час цікавейшай барацьбы за перамогу!*

*Кубак у нашых дзяўчат! Гэта радуе. Тым больш, што ўзят верх над моцным праціўнікам.*

*Хочацца павіншаваць трэнера каманды Г. М. Грудо і студэнтак з перамогай, з навагоднім святам і пажадаць у наступным годзе новых перамог!*



*Тэкст і фота М. ХАМЦА.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 19593
Тыраж 2.000 экз. Заказ 1572.